УДК 32:316.614–053.6

**Э.Р. Іофе,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры паліталогіі і права БДПУ*

# ФАКТАРЫ, ІНСТЫТУТЫ, ФОРМЫ І МЕТАДЫ ПАЛІТЫЧНАЙ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ ТРАНСФАРМУЕМАГА ГРАМАДСТВА

Палітычная сацыялізацыя ўяўляе сабой сукупнасць працэсаў, у ходзе якіх засвойваюцца, падтрымліваюцца і перадаюцца ад пакалення да пакалення асноўныя каштоўнасці палітычнай культуры.

*Палітычная сацыялізацыя асобы* – складаны працэс грамадзянскага станаўлення, фарміравання палітычных арыентацый, набыцця навыкаў грамадскай дзейнасці, ралізацыі іх у сферы палітычных адносін.

Сучасная Беларусь перажывае такі перыяд трансфармацыйнага развіцця ад савецкай да дэмакратычнай палітычнай сістэмы, якому не адпавядае ні адна з мадэлей палітычнай сацыялізацыі (ні мадэль «падпарадкавання», ні мадэль «інтарэсу»).

На палітычную свядомасць моладзі Беларусі, як і ўсяго беларускага народа, уплывае «глабальны крызіс». Яго ўздзеянне на моладзь неадназначнае. З аднаго боку, крызіс нярэдка пазбаўляе магчымасці зарабатку, навучання ў ВНУ, фарміруе пачуцце нестабільнасці і сацыяльную апатыю. Разам з тым ён аказваецца для беларускай моладзі стымулам да сацыяльнай, каштоўнастнай і палітычнай рэфлексіі. У маладых беларусаў з’яўляецца рэдкі шанс выйсці за псіхалагічныя межы «шчаслівых нулявых», убачыць альтэрнатыўны бок беларускай палітыкі, прынамсі, яе сацыяльна-эканамічнага «базісу».

Аналіз сучаснага стану маладога пакалення нашай рэспублікі дае падставу сцвярджаць, што два ўказаныя трэнды – народжаны афіцыйнай рыторыкай і СМІ, міфалагічны і рэфлексіўны вызначаюць успрыманне сацыяльна-эканамічнага крызісу расійскай моладдзю. Сёння першы, міфалагічны, трэнд не з’яўляецца масавым. Але ён, безумоўна, пераважае над другім. Міфалагічны кантэкст выступае дастаткова зручнай (і для моладзі, і для ўлады) тлумачальнай схемай. Яна дазваляе «дэлегіраваць» адказнасць за негатыўныя змены на глабальны ўзровень, усклаўшы яе на знешнія «незалежныя пераменныя» і праз іх на калектыўныя Усход і Захад як крыніцы беларускай «нестабільнасці».

Трансфармуемаму грамадству Рэспублікі Беларусь патрэбна спецыфічная, прыстасаваная да яго ўмоў мадэль палітычнай сацыялізацыі. Асабліва гэта адносіцца да падрастаючага пакалення, схільнага да першаснай сацыялізацыі. На думку расійскага вучонага-палітолага А.В. Суровавай, такая мадэль можа быць вызначана як мадэль «комплексу», якая абапіраецца на сукупнасць агентаў і метадаў уздзеяння. Каштоўнаснымі арыенцірамі дадзенай мадэлі закліканы быць каштоўнасці і прынцыпы дэмакратычнага грамадства, а агентамі павінны выступаць узаемадзеючыя паміж сабой структуры дзяржавы і грамадзянскай супольнасці пры каардынуючай ролі дзяржавы і панаванні палітычных механізмаў дэмакратычнага тыпу. Такая пераходная мадэль сацыялізацыі моладзі цалкам можа быць эфектыўнай у трансфармуемым грамадстве і здольнай эвалюцыяніраваць разам з палітычнай сістэмай у дэмакратычную мадэль.

У працэсе палітычнай сацыялізацыі моладзі Беларусі вялікую ролю адыгрываюць фактары і інстытуты сацыялізацыі.

У якасці важнейшых фактараў палітычнай сацыялізацыі выступаюць:

1) біялагічныя (у прыватнасці, біялагічная спадчыннасць індывіда);
2) псіхалагічныя (уплыў на працэс сацыялізацыі тэмпераменту, характару, здольнасцей асобы, якая фарміруецца ў свядомага, палітычна актыўнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і г. д.);
3) сацыяльныя (эканамічныя, палітычныя, у прыватнасці дзяржаўнае ўладкаванне, культурныя).

Дзейнасць дзяржавы як ключавога суб’екта палітычнай сацыялізацыі моладзі мяркуе выкананне ёй дзвюх асноўных і ўзаемазвязаных функцый: арганізацыйнай, падразумяваючай арганізацыю і каардынацыю дзеянняў розных сацыялізуючых агентаў у межах адзінага генералізавага патоку сацыялізацыі і ажыццяўленне пэўнага кантролю над імі, і светапоглядной, звязанай з распаўсюджаннем ідэалогій і фарміраваннем аўтарытэта раздзяляемых «вярхамі» і «нізамі» каштоўнасцей з мэтай кансалідацыі грамадства і забеспячэння падтрымкі правячаму рэжыму.

Пытанне аб легітымнасці дзяржаўнай улады ў кантэксце палітычнай сацыялізацыі моладзі выступае рашаючай умовай, якая вызначае, ці будуць дэкларыруемыя правячай элітай ідэалы і каштоўнасці разглядацца большасцю моладзі як аўтарытэтныя, і свае, адпаведна, прымацца і засвойвацца у працэсе палітычнай сацыялізацыі.

Адпаведнасць распаўсюджваемых і папулярызуемых дзяржавай палітычных ідэалаў, норм і каштоўнасцей базавым палітыка- і сацыякультурным характарыстыкам дадзенага грамадства значна павышае магчымасць засваення гэтых каштоўнасцей шырокімі слаямі моладзі. Супрацьлеглая сітуацыя параджае каштоўнасны крызіс і сацыякультурны раскол у грамадстве.

Вельмі важную ролю ў фарміраванні асабы і палітычнай сацыялізацыі моладзі адыгрывае сістэма культуры. Зразумела, культура аказвае сацыялізуючы ўплыў на фарміраванне асобы маладога чалавека не адасоблена ад іншых інстытутаў сацыялізацыі, а разам з імі і праз іх, што рэзка ўзмацняе выхаваўчы вынік працэсу палітычнай сацыялізацыі.

Істотным фактарам палітычнай сацыялізацыі моладзі з'яўляецца дзяржаўная маладзёжная палітыка, здольная пераадолець негатыўныя з'явы ў адносінах дзяржавы да моладзі. Ва ўмовах трансфармуемага грамадства і слабаразвітасці грамадзянскай супольнасці менавіта дзяржава выступае галоўным гарантам забеспячэння правоў і свабод кожнай канкрэтнай асобы і ўсяго грамадства ў цэлым.

У цэнтры дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі павінна знаходзіцца праблема грамадзянскага і ваенна-патрыятычнага выхавання маладых беларусаў, узаемадзеяння з палітычнымі, грамадскімі, маладзёжнымі і студэнцкімі арганізацыямі, у тым ліку і ў рамках палажэння канцэпцыі ДМП. у якасці аднаго з эфектыўных рашэнняў існуючых праблем уяўляецца зварот менавіта да канцэпцыі палітычнай сацыялізацыі моладзі, гэта значыць уваходжанні маладога чалавека ў палітыку. Рэалізацыя палітыкі дзяржавы ў адносінах «стратэгічнага рэсурсу» краіны – моладзі – выступае як паказчык агульнай эфектыўнасці і адэкватнасці дзяржаўнай стратэгіі па стабілізацыі і дэмакратызацыі грамадства.

Нельга не згадзіцца з беларускім сацыёлагам І.В. Лашук, якая лічыць што мэтанакіраванае кіраванне маладзёжнай палітыкай будзе тады эфектыўным, калі як у цэнтры, так і на месцах (у працоўных калектывах, раёнах, гарадах, адміністратыўных рэгіёнах і г. д.) будуць створаны цэнтры сацыялагічнай службы, заклікаcivныя не толькі ажыццяўляць аналітычную дзейнасць, але і фарміраваць грамадскую думку аб рэальным становішчы моладзі, яе праблемах і шляхах іх пераадолення.

З мэтай падтрымкі і каардынацыі дзейнасці дзіцячых і маладзёжных арганізацый указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зацверджана праграма развіцця маладзёжнай палітыкі на 2006–2010 гг. Асноўнай задачай праграмы з'яўляецца ўключэнне моладзі ў сацыяльнае, культурнае і палітычнае жыццё грамадства, паляпшэнне ўмоў для актыўнага і эфектыўнага ўдзелу юнакоў і дзяўчат у палітычнай і сацыяльна-эканамічнай дзейнасці.

На думку беларускага даследчыка М.Л. Мысліўца, значнымі фактарамі палітычнай сацыялізацыі студэнцкай моладзі у сучаснай Беларускай дзяржаве з'яўляюцца канстытуцыйнае замацаванне новых форм дзяржаўнага і грамадскага жыцця, стабілізацыя эканамічнай, палітычнай і сацыяльнай сфер. Нараўне з гэтым істотнае ўздзеянне аказваюць такія глабальныя з'явы, як рост насілля і тэрору ў свеце, лакальныя войны, пашырэнне ЕС, стварэнне саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, экалагічныя праблемы і інш. Дадзеныя працэсы развіваюцца вельмі дынамічна, носяць крайне складаны, часам дастаткова супярэчлівы характар. Таму патрэбна іх глыбокае асэнсаванне як на тэарэтычным узроўні, так і на ўзроўні звычайнай свядомасці [1, с.10–11].

Каб даведацца, у якім настроі знаходзіцца беларускае грамадства ў канцы 2009 г., інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь правёў сацыялагічны маніторынг «Грамадская думка аб сацыяльна-палітычнай сітуацыі». У апытанні прынялі ўдзел 1976 чалавек з усіх абласных цэнтраў краіны і Мінска, а таксама раённых гарадоў і сельскіх населеных пунктаў.

У параўнанні з канцом 2008 г. павялічылася колькасць беларусаў (з 68 да 73 %), якія лічаць, што краіна развіваецца ў правільным накірунку.

Палітычнае становішча ў рэспубліцы лічаць спакойным каля 76 % рэспандэнтаў. Пераважная большасць (амаль 96 %, згодна з данымі даследавання), адмаўляюць магчымасць свайго ўдзелу ў розных акцыях пратэсту.

Як і ў канцы 2008 г., Кіраўнік дзяржавы карыстаецца высокім даверам грамадзян – яго падтрымліваюць каля 80 % апытаных. Ураду давяраюць 68 %, парламенту – 67 %, мясцовым органам улады – каля 59 % [2, с.1].

Аўтарам артыкула ў 2006–2008 гг. было праведзена сацыялагічнае даследаванне на аддзяленні культуралогіі факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта і сярод студэнтаў двух факультэтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка – беларускай філалогіі і куль-

туры і сацыяльна-педагагічных тэхналогій. Усяго было апытана 638 рэспандэнтаў.

Атрыманая ў выніку даследавання інфармацыя сведчыць, што толькі 33,2 % апытаных давяраюць Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь і 39,5 % – Савету Міністраў нашай краіны. Гэта сведчыць аб пэўнай ступені адчужанасці сучаснай студэнцкай моладзі ад дзяржавы і грамадства.

Падобная ацэнка дзейнасці ўладарных структур з боку моладзі, як кажуць, інфармацыя для роздуму. Яна можа прывесці да прававога нігілізму і нарастання радыкальных настрояў ў маладзёжным асяроддзі і пагражае грамадскай стабільнасці і ўстоям дзяржавы. Парламент і ўрад павінны зрабіць неабходныя высновы з ацэнкі іх дзейнасці з боку беларускай моладзі.

У якасці асноўных інстытутаў палітычнай сацыялізацыі ў грамадстве функцыянуюць: сям'я, дашкольная дзіцячая ўстанова, школа, ВНУ, сродкі масавай інфармацыі, кампанія равеснікаў, працоўны калектыў, сацыякультурная супольнасць.

На думку вядомага амерыканскага вучонага-сацыёлага Н. Смелзера, інстытуты, асобныя людзі і групы, якія садзейнічаюць сацыялізацыі, называюцца агентамі сацыялізацыі [3, с.114].

Расійскі даследчык А.П. Сольскі адзначае, што асноўнымі агентамі сацыялізацыі з'яўляюцца сям'я, сістэма адукацыі і выхавання, аб'екты культуры, кола асабістых і калектыўных сувязей, сродкі масавай інфармацыі, грамадскія фарміраванні, працоўныя калектывы, дзелавое асяроддзе, дзяржаўныя ўстановы, мясцовыя згуртаванні і іх органы [4, с.13].

Сям'я з'яўляецца важнейшай крыніцай палітычнай інфармацыі для маладога пакалення, яе галоўным інтэрпрэтатарам, аранжыроўшчыкам. У заходняй паліталогіі сям'я называецца «ключавым агентам», праз які палітычная культура перадаецца ад аднаго пакалення да іншага [5, с. 107]. Пераважная большасць падлеткаў чуюць палітычную інфармацыю ад бацькоў, і многія з іх удзельнічаюць у сямейных размовах на гэту тэму.

З-за сваёй інтымнасці, канфідэнцыяльнасці сацыялізуючая роля сям'і велізарная. Дзякуючы гэтаму, яна здольна «перакрыць» усе іншыя віды сацыялізуючага ўздзеяння на юнака або дзяўчыну. Разам з тым неабходна адзначыць пэўную кансерватыўнасць сямейнага ўплыву ў працэсе палітычнай сацыялізацыі моладзі. Бываюць выпадкі, калі сям'я перадае палітычныя ўстаноўкі, якія ўжо не адпавядаюць сучаснасці, перашкаджаюць пластычнасці ў палітычных арыентацыях.

На параўнальна раннім этапе палітычнай сацыялізацыі да сям'і далучаюцца дашкольныя адукацыйныя ўстановы, а затым школа, пачатковыя, сярэднія і вышэйшыя прафесійныя навучальныя ўстановы. Яны ўплываюць на працэс палітычнай сацыялізацыі моладзі праз навучанне, выхаванне і нефармальныя сувязі, якія там устанаўліваюцца. Своеасаблівасць гэтага інстытута або «агента» сацыялізацыі ў тым, што навучальныя ўстановы могуць ажыццяўляць палітычнае выхаванне мэтанакіравана праз навучальныя праграмы і адпаведны падбор педагогаў, выкладчыкаў.

Што датычыцца палітычнай сацыялізацыі студэнцкай моладзі, якая ажыццяўляецца ў ВНУ, то тут яна выступае не толькі як спосаб трансляцыі накопленага сацыяльна-палітычнага вопыту, але і як важнейшы сродак фарміравання дэмакратычна арыентаванай, палітычна развітай і грамадзянска актыўнай асобы.

Пэўная сістэма палітычнай сацыялізацыі студэнцтва створана за апошнія гады ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Адным з асноўных напрамкаў арганізацыі ідэалагічнай работы з моладдзю тут стала фарміраванне ў яе высокай палітычнай культуры, адказнага і актыўнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь. Змест дадзенай работы накіраваны на набыццё студэнтамі сацыяльнага і палітычнага вопыту, накопленага грамадствам, мяркуе фарміраванне ў іх палітычных каштоўнасцей і ідэалаў беларускай дзяржавы і грамадства, вопыту грамадскай дзейнасці, разуменне складанасці сацыяльна-палітычных працэсаў, уменне рабіць выбар і несці за яго адказнасць.

Асноўнымі метадамі і накірункамі патрыятычнай і пошукава-краязнаўчай дзейнасці ў БДПУ сталі вяртанне забытых імёнаў нацыянальных герояў, правядзенне работы па вывучэнні культуры асобных рэгіёнаў Беларусі, сувязь з гарадскімі і раённымі музеямі, бібліятэкамі, правядзенне пошукавай работы, збор і апрацоўка інфармацыі аб нацыянальных традыцыях, асаблівасцях побыту жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі, вывучэнне фальклору і этнаграфіі роднага краю, правядзенне паходаў і экскурсій па славутых кутках Беларусі.

З мэтай актывізацыі турысцкага руху, з улікам магчымасці дакрануцца да гісторыі сваёй Радзімы, пазнаёміцца з выдатнымі людзьмі, у 2009–2010 навучальным годзе працягваецца работа па правядзенні «Зорных паходаў» па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа. БДПУ у нашай рэспубліцы стаў першапраходцам гэтай слаўнай традыцыіі і ажыццяўляе яе ўжо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

Эфектыўнасць арганізацыі ідэалагічнай работы ў вышэйшых навучальных установах, у тым ліку работы па павышэнні палітыч-

най сацыялізацыі студэнцкай моладзі залежыць перш за ўсё ад узроўню прафесійна-педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў, іх гатоўнасці актыўна ўздзейнічаць на студэнтаў, мэтанакіравана садзейнічаць фарміраванню ў іх пэўнай сістэмы поглядаў, паняццяў, адносін. У сувязі з гэтым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь былі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі «Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі эфектыўнасці ўдзелу прафесарска-выкладчыцкага складу ў ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце».

Значная роля ў фарміраванні палітычнай культуры студэнцкай моладзі ў працэсе яе палітычнай сацыялізацыі традыцыйна адводзіцца навучальна-выхаваўчаму працэсу і непасрэдна педагогам-гуманітарыям.

Кафедра паліталогіі і права БДПУ спрабуе вырашыць дадзеную праблему шляхам чытання спецкурсаў з улікам спецыфікі факультэта. Так, на гістарычным факультэце чытаецца спецкурс «Палітычныя дактрыны сучаснасці», на факультэце беларускай філалогіі і культуры – «Палітыка і культура», «Палітычная культура грамадства», на факультэце пачатковай адукацыі – «Правы чалавека і правы дзіцяці». Выкладчыкі кафедры эканамічнай тэорыі і эканамічнага выхавання чытаюць спецкурс «Эканамічнае выхаванне школьнікаў», кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі – «Асоба ў гістарычным працэсе», «Станаўленне беларускай дзяржаўнасці», «Гісторыя маладзёжнага руху».

Калі ўвогуле ацэньваць ролю выкладчыкаў кафедр сацыяльна-гуманітарных навук ВНУ нашай рэспублікі, то сур’ёзную трывогу выклікае факт нізкага ўзроўню даверу студэнтаў да інфармацыі аб палітыцы, якую яны атрымоўваюць у сваіх універсітэтах і інстытутах, а таксама ў цэлым невысокая ацэнка якасці выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Толькі нямногім больш за палову ўсіх апытаных студэнтаў задаволены якасцю выкладання гэтых прадметаў у сваёй ВНУ.

Важную ролю сярод інстытутаў палітычнай сацыялізацыі сучаснага студэнцтва адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі. Да іх адносяцца прэса, масавыя даведнікі, радыё, тэлебачанне, кіно- і гуказапіс, відэазапіс, Інтэрнэт.

На першым месцы сярод крыніц палітычнай інфармацыі моладзі знаходзяцца аўдыёвізуальныя сродкі і, перш за ўсё, тэлебачанне. Пераважная большасць юнакоў і дзяўчат даведваюцца аб палітычных падзеях у краіне, свеце, рэгіёне з тэле- і радыёперадач. Але пры гэтым інфармацыя аб палітыцы дзяржаўных СМІ Рэспублікі Беларусь карыстаецца нязначным даверам у студэнтаў. Рэйтынг даверу да яе зніжаецца пры пераходзе з курса на курс: ёй больш, чым іншым крыніцам, давяраюць 35,2 % першакурснікаў і толькі 10,5 % апытаных студэнтаў пятага курса.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і рэктарат БДПУ надае вялікую ўвагу фарміраванню інфармацыйнай культуры студэнтаў.

Да ліку сучасных інстытутаў сацыялізацыі адносіцца група равеснікаў, з якой цесна звязаны малады чалавек, на якую ён раўняецца, уплыў якой адчувае. Група, што выступае ў якасці рэферэнтнай, можа аказваць на юнака або дзяўчыну большае ўздзеянне, чым сям’я, школа і універсітэт, не толькі замацоўвае або дабудоўвае, але і перабудоўвае, калі прыходзіць з імі ў супярэчнасць, каштоўнасці і ўстаноўкі, якія спачатку склаліся пад уздзеяннем сям’і, школы і ВНУ. Асабліва вялікім з’яўляецца сацыялізуючае ўздзеянне груп равеснікаў адносна замкнутых, прасторава лакалізаваных груп («тусовак»), што дзейнічаюць у буйных гарадах. Аб дзейнасці нефармальных тусовак ведаюць 32,5 % студэнтаў. У апошнія гады каштоўнасць інфармацыйных палітычных сувязей з групай равеснікаў пайшла на спад.

У якасці важнага сродку палітычнай сацыялізацыі выступаюць партыі і палітычныя арганізацыі, якія вядуць значную прапагандысцкую работу і тым самым садзейнічаюць палітычнай сацыялізацыі моладзі.

Іх аўтарытэт у сучаснай Беларусі сярод студэнцкай моладзі з’яўляецца невысокім з-за іх шматлікасці, невыразнасці і падобнасці праграм, слабасці іх сацыяльнай базы, адсутнасці арганізаванай грамадскай падтрымкі. У сувязі з гэтым палітычныя партыі не карыстаюцца падтрымкай сярод пераважнай большасці студэнтаў і не выклікаюць у іх жадання далучыцца да іх дзейнасці. Толькі 2,7 % студэнтаў указалі на ролю палітычных партый як фактару, які значна ўплывае на фарміраванне палітычнага светапогляду. Павелічэнню папулярнасці палітычных партый можа садзейнічаць не толькі актывізацыя іх дзейнасці, але і стварэнне маладзёжных арганізацый, якія ўзаемадзейчаюць з партыямі і здольны больш актыўна весці работу з маладымі людзьмі.

Адной з форм палітычнай сацыялізацыі студэнцкай моладзі Беларусі і адначасова адным з праяўленняў яе ўключанасці ў палітычныя працэсы з’яўляецца ўдзел студэнтаў у дзейнасці маладзёжных грамадскіх аб’яднанняў. З грамадскіх аб’яднанняў найбольшай папулярнасцю сярод моладзі карыстаецца Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і прафсаюзы. У іх прымаюць удзел адпаведна 65,3 % і 25,8 % юнакоў і дзяўчат. Іншыя грамадскія арганізацыі, як і палітычныя партыі, не карыстаюцца папулярнасцю ў маладзёжным асяроддзі. Працэнт удзелу ў іх дзейнасці вагаецца ад 2,6 % (грамадскія аб’яд-

нанні, акрамя БРСМ) да 0,4 % (палітычныя партыі) [6, с. 65].

Цікавай формай уключанасці маладых людзей у палітычныя працэсы з'яўляецца маладзёжны парламентарызм. Яго развіццё садзейнічае вырашэнню такіх актуальных пытанняў, як праблемы ўзаемаадносін заканадаўчых і выканаўчых органаў улады з маладзёжнымі аб'яднаннямі, павышэнню правасвядомасці моладзі, росту яе палітычнай актыўнасці.

Аналізуючы гэту форму палітычнай сацыялізацыі моладзі, беларускі даследчык Е.С. Бабосава акцэнтуе ўвагу на наступнае:

«У Рэспубліцы Беларусь ідэя стварэння маладзёжнага парламента цяпер актыўна распрацоўваецца. Ажыццяўленне дадзенага праекта пачалося 16 снежня 2005 г. калі ўдзельнікамі Міжнароднага форуму па праблемах маладзёжнага руху было прынята рашэнне аб стварэнні маладзёжнага парламента, членамі якога могуць стаць прадстаўнікі ўсіх зарэгістраваных маладзёжных грамадскіх арганізацый ва ўзросце ад 14 да 31 года. Штогод праводзяцца міжнародныя канферэнцыі, мэтай якіх з'яўляецца ўзмацненне ўзаемадзеяння інстытутаў дзяржавы, маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў у рэалізацыі сацыяльна значных праграм і праектаў. У іх удзельнічаюць прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, у тым ліку і замежных, работнікі органаў дзяржаўнага кіравання па пытаннях маладзёжнай палітыкі, педагогі, вучоныя.

У Рэспубліцы Беларусь з 2007 г. функцыянуе грамадскае аб'яднанне Маладзёжная палата, якое дзейнічае на грамадскіх пачатках і ўключана ў распрацоўку праектаў і праграм, арыентаваных на павышэнне палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат. Арганізацыя была створана пры ўдзеле Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, аддзела па справах моладзі і Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, а таксама Мінскага гарадскога камітэта АА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». У праекце ўдзельнічаюць 55 падлеткаў ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў. Стварэнне Маладзёжнай палаты і развіццё маладзёжнага парламентарызму ў Рэспубліцы Беларусь уяўляецца важным і своечасовым крокам па прыцягненні моладзі да актыўнага ўдзелу ў жыццядзейнасці ўсіх сфер грамадства, а таксама распрацоўцы і рэалізацыі рашэнняў у галіне дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі» [6, с.71].

Разглядаючы метады палітычнай сацыялізацыі студэнцкай моладзі, неабходна вылучыць стымулявання і арганізацыі палітычнай дзейнасці (прывучэнне, патрабаванне, прыклад, даручэнне, гульня, спаборніцтва і г. д.) і метады фарміравання палітычнай свядомасці (гутаркі, дыспуты, лекцыі, абмеркаванні матэрыялаў СМІ і г. д.).

Адно з прыярытэтных месц у сучасны перыяд займае выкладанне у рамках Дзяржаўнага адукацыйнага стандарту сістэмы грамадазнаўчых дысцыплін у розных навучальных установах. Гэта найбольш інстытуцыялізаваны сродак фарміравання сацыяльна-палітычных ведаў у моладзі. Да таго ж ён найбольш структураваны і масавы па ахопе маладзёжнай аўдыторыі.

Павышэнне статусу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, якасць іх выкладання павінны выступаць як адна з важнейшых задач вышэйшай школы. Рэальнымі спосабамі яе вырашэння могуць служыць прыток новых высокакваліфікаваных кадраў у сферу выкладчыцкай дзейнасці, задавальненне патрэбы ў сучаснай навуковай літаратуры, актывізацыя навуковай дзейнасці студэнтаў у галіне распрацоўкі актуальных праблем грамадскага развіцця.

Важнае значэнне ў навуковым забеспячэнні працэсу ідэйна-выхаваўчай работы ВНУ можа набыць сацыялагічны маніторынг дынамікі каштоўнасных арыентацый і палітычных пераваг студэнцкай моладзі.

Абавязковай і неад'емнай часткай праграмы сярэдняй школы стала грамадзянская прававая адукацыя. Яна з'яўляецца фундаментам для выхавання ў маладога чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі.

У якасці важнейшага сродку палітычнай сацыялізацыі моладзі, на думку расійскага даследчыка А.В. Мельнікава, трэба разглядаць і дзяржаўную сімволіку – неад'емную частку палітыкі і палітычнай ідэалогіі [7, с.17].

На наш погляд, з пачатку XXI ст. адбылася змена мадэлей адукацыі: ад закрытай, нарматыўнай мадэлі, у аснове якой было ўяўленне аб вучню або студэнце як «сасудзе, які настаўнік, выкладчык павінен напоўніць сапраўднымі ведамі», – на карысць адкрытай, развіццёвай мадэлі, якая арыентавана не на запамінанне інфармацыі, а на развіццё навыкаў разумення, усведамлення і ўмелага выкарыстання ведаў, асабліва па гісторыі і грамадазнаўстве.

Толькі комплекснае выкарыстанне фактараў, інстытутаў, форм, метадаў і сродкаў палітычнай сацыялізацыі служыць больш эфектыўнаму развіццю палітычнай і прававой культуры моладзі. У рэшце рэшт, ад удасканалення дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі і павышэння палітычнай сацыялізацыі моладзі ў многім залежыць будучае нашай роднай краіны – Рэспублікі Беларусь.

Літаратура

1. *Мысливец, Н.Л.* Особенности политической социализации студенческой молодежи в условиях функционирования суверенного белорусского государства: автореф. дис. ... канд. социол. наук / Н.Л. Мыслівец. – Минск, 2005 – 21 с.
2. *Владимирова, Т.* Поживаем,. добро наживаем / *Т. Владимирова* // Рэспубліка. – 2010, – 26 студз.
3. *Смелзер, Н.* Социология / Н. Смелзер. – М: «Феникс», 1994.

4. *Сольский, О.П.* Особенности политической социализации молодежи в условиях местного сообщества: автореф. дис. ... канд. социол. Наук / О.П. Сольский. – М., 2004. –21 с.
5. *Dawson, R.E., Prewitt K.* Political Socialization / R.E. Dawson, K. Prewitt. – Boston, 1969.
6. *Бабосова, Е.С*. Молодежная политика как фактор устойчивого развития белорусского общества / Е.С. Бабосова // Взаимодействие устойчивости и инновационности развития белорусского общества. – Минск: Белорусская наука, 2009. – 459 с.
7. *Мельников, А.В.* Политическая социализация молодежи в современной России: автореф. дис. ... канд. полит. наук / А.В. Мельников. – Орел, 2004. – 22 с.

*Summary*

*Article is devoted the analysis of factors, institutes, forms and methods of political socialisation of youth of Belarus in the conditions of a transformed society. It is written on the basis of the sociological researches which were spent by the author in high schools of Minsk city in 2006-2008, and works on this problem of the Belarus and Russian scientists-sociologists and political scientists in the first decade of the XXI century Byelarussian.*